# ТЭХНІЧНАЕ І МАТЭРЫЯЛЬНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ЗАМКАЎ ВКЛУ ЧАСЫ ЖЫГІМОНТА І СТАРОГА І ЖЫГІМОНТА ІІ АЎГУСТА

**А.А. Іваноў**

Асобнае месца сярод мерапрыемстваў, звязаных з забеспячэннем абароназдольнасці дзяржавы займаюць пытанні тэхнічнага пераўзбраення і матэрыяльнага забеспячэння замкаў правіянтам і будаўнічымі матэрыяламі. Асабліва востра гэтая праблема закранала ўскраінныя землі і замкі, якія часцей за іншыя зведвалі ўдары непрыяцельскіх войск.

У XVI ст. пры здабыванні гарадоў і замкаў пачалі актыўна прымяняць артылерыю, што паўплывала на працэс пераўзбраення замкавых гарнізонаў і на пераход іх да выкарыстання агнястрэльнай зброі. У дадзеным аспекце вельмі важна вылучыць крыніцы, з якіх адбывалася папаўненне сродкамі артылерыі замкаў і гарадоў [7, с. 265–267].

Агнястрэльная зброя трапляла ў ВКЛ праз тэрыторыю Кароны Польскай, а напрыканцы XV-пачатку XVI ст. уласна з польскіх зямель, дзе вытворчасць гармат распачалася на некалькі дзесяцігоддзяў раней, чым на тэрыторыі ВКЛ [6, с. 16–22].

Згодна з даследваннямі польскага гісторыка Браништэйна першыя ліцейныя майстэрні з'явіліся ў ВКЛ недзе напачатку XVI ст. у Вільні. Ён вызначае дату стварэння ў Вільні цэха ліцейшчыкаў, які аб'ядноўваў майстроў, што займаліся не толькі вырабам зброі, але і адліваннем званоў для цэркваў і манастыроў, іх мастацкім аздабленнем [6, с. 17]. Першыя ўзгадкі аб цэху датычацца пачатку 40-х гг. XVI ст. Пры гэтым першымі майстрамі-ліцейшчыкамі былі выхадцы з краін Заходняй Еўропы: немцы, чэхі і нават італьянцы [6, с. 17–24].

Побач з уласнай вытворчасцю доўгі час агнястрэльная зброя увозілася з-за межаў ВКЛ. Прычына-немагчымасць аднаго цэха забяспечыць замкі і гарады ВКЛ гарматамі ў дастатковай колькасці, тым больш што неабходна было паралельна забяспечваць сродкамі артылерыі і палявыя войскі. Хутчэй за ўсё віленскі цэх аж да канца першай паловы XVI ст. заставаўся адзіным цэнтрам вытворчасці агнястрэльнай зброі ў ВКЛ.

У рэвізіі віленскага арсеналу 1551–1565 гг. прыводзіцца пералік гармат, а таксама пералік замкаў, памежных і інфлянцкіх, у якія напярэдадні і ў першыя гады інфлянцкай вайны былі разасланы гарматы.

Агульная колькасць гармат складала 245 штук. Можна сцвярджаць, што разсыланню па замках не падлягалі гарматы віленскія і гетманскія, а значыць у распараджэнні дзяржавы для забеспячэння абароназдольнасці

украінных і інфлянцкіх замкаў знаходзілася 145 гармат.

У перыяд з 1551 па 1565 гг. па розных замках ВКЛ былі разасланы гарматы, амуніцыя і іншыя прылады і віды зброі [8, с. 290–293]. Агульная колькасць разасланых гармат складае 173, што перавышае колькасць «свабодных» гармат віленскага арсеналу. Як зазначае польскі даследчык Т. Новак, згодна з архіўнымі дадзенымі, некаторыя з разасланых гармат мелі зусім не віленскае паходжанне, альбо былі дасланыя з іншых замкаў ВКЛ і Польскай кароны [8, с. 295].

Сярод разасланых гармат большасць складаюць гарматы з дастаткова невялікай вагай і не надта доўгім ствалом, якія маюць большую хуткастрэльнасць, што ва ўмовах адбіцця варожых атак і спроб штурма мае значэнне большае, чым магчымасць разбурыць варожыя ўмацаванні [7, с. 273].

Вельмі важна разгледзіць у дадзеным аспекце і крыніцы адкуль пастаўлялася сыравіна для вытворчасці гармат. Вядома, што на тэрыторыі ВКЛ не было сваіх жалезных руд, прыдатных для вытворчасці зброі, асабліва гармат і куль для іх. ВКЛ, з-за недахопу ўласнай сыравіны, купляла яе за мяжой: у Кароне Польскай, Венгрыі і Карынціі. У перыяд з 1552 па 1565 гг. з Кракава да Вільні было адпраўлена на патрэбы Віленскага  толькі медзі на агульную суму 43500 злотых [6, с. 24–25].

Складаным пытаннем застаецца вывучэнне стану артылерыі ў гарадах ВКЛ да разсылання гармат з віленскага арсеналу. Як зазначае Г. Сагановіч падчас захопу Полацка войскамі Івана IV у замку знаходзілася толькі 20-40 гармат [4, с. 263–270]. У горад у 1559 і 1562 гг. была даслана 21 гармата. Атрымліваецца, што да моманту пачатку Інфлянцкай вайны Полацк мог мець да 20 уласных гармат.

Амуніцыя і зброя былі дасланы ў 65 інфлянцкіх замкаў і замкаў ВКЛ, гарматы-толькі ў 32 з іх. Так побач са 173 гарматамі да замкаў было даслана 3100 гакаўніц і 950 ручніц [7, с. 270–271]. Такая колькасць агнястрэльнай зброі з’яўляецца прыкладам той тэндэнцыі, што ў XVI ст. значна ўзрасла роля пехоты, якая ўжо дастаткова эфектыўна магла супрацьстаяць конніцы, а ва ўмовах абароны замкаў увогуле зайвала дамінуючае становішча.

Аднак, варта заўважыць, што для большасці замкаў праблема забеспячэння амуніцыяй і зброяй стаяла вельмі вострa. Так, падчас рэвізіі замкаў Валынскай зямлі, праведзенай у 1545 годзе, было выяўлена, што амаль усе яны былі недастаткова, альбо увогуле не забяспечаны зброяй і амуніцыяй. Рэвізор зазначае, што замак ў Жытоміры не мае гармат і практычна не мае ручной агнястрэльнай зброі [9, с. 65–67]. У Вінніцы, паводле рэвізіі, маецца 2 гарматы, адна з якіх знаходзіцца ў вельмі

дрэнным стане, а таксама 26 гакаўніц [9, с. 35–37]. Аднак у горадзе няма нават парахоўні для захоўвання пораху. Толькі ў Крамянцы ў арсенале замка налічваецца 29 гармат, 10 гакаўніц, 33 ручніцы і вялікі запас пораху, серы, волава і куль [9, с. 32–34]. У 1558 г. туды дадаткова было адпраўлена 9 гармат [8, с. 290–293]. Астатнія замкі (Луцкі, Уладзімерскі, Брацлаўскі) былі забяспечаны зброяй і амуніцыяй недастаткова.

Важнай праблемай пры забеспячэнні недаступнасці замкаў заставалася стварэнне запасаў правіянту. Здаралася, што ні насельніцтва, ні кіраўніцтва гарадоў ВКЛ проста не клапацілася пра стварэнне складскіх запасаў правіянту, а прадукты, якія павінны былі ісці на стварэнне стратэгічнага запасу, ішлі на продаж, прыносячы іх абладальнікам значныя прыбыткі. У адрозненне ад папярэдніх часоў у XVI ст. удасканалена была тэхніка вядзеня аблог: на змену прымітыўнай тэхнікі прыйшла артылерыя, з дапамогай якой за невялікі тэрмін можна было зруйнаваць самыя непрыступныя цвярдыні, але гэта зусім не абавязвала гарадское кіраўніцтва не клапаціцца пра забеспячэнне горада харчовымі запасамі, таму што падчас шырокамаштабных кампаній можна было лёгка трапіць за лінію фронта і нават без абложных дзеянняў праціўніка зведаць цяжкасці з папаўненнем харчовага запасу.

Праблемы забеспячэння правіянтам знайшлі сваё адлюстраванне ў час правядзення рэвізіі на валынскіх землях. Так, Луцк акрамя недахопу зброі і амуніцыі меў значныя праблемы і з харчовымі прыпасамі. Гарадскі стараста і ключнік паведамілі рэвізору, што даходу з двароў, які павінен ісці на стварэнне харчовага запасу, ледзь хапае на утрыманне саміх двароў і на аплату падаткаў і павіннасцей да скарбу. Зямяне і мяшчане сказалі, што ў замку ўвогуле няма звычаю рабіць запасаў, а ў часы небяспекі кожны павінен сам клапаціцца пра харч [9, с. 26–27].

У момант чарговага пагаршэння адносін з Маскоўскай дзяржавай Жыгімонт Стары наказаў направіць да важнейшых памежных замкаў значную колькасць збожжа, назначыўшы пры гэтым і асоб, непасрэдна адказных, а таксама ўсклаўшы гэтую павіннасць на некаторыя гарады, адкуль збожжа і павінна было быць адпраўлена да Кіева, Полацка і Віцебска ў назначаным памеры [3, с. 289–290].

Згодна ваенным артыкулам, соймавым ўхвалам і статутам забеспячэнне рот і гарнізонаў правіянтам ажыцяўлялася па фіксіраваным кошце, які быў звычайна ніжэйшы за рынкавы пры прад'яўленні спецыяльных лістоў [2, с. 107]. Гандляроў, якія спрабавалі завысіць кошт прадуктаў, чакала пакаранне ў выглядзе штрафу. Такія меры па забеспячэнню найманага войска танным правіянтам павінны былі кампенсаваць недастатковасць грашовага забеспячэння [5, с. 256–257].

Паралельна з выданнем «уставаў» на ільготныя кошты на прадукты харчавання можна сустрэць сітуацыю, калі пэўная доля правіянту ўключаецца ў штогадовы юргельт, за які ваяры і майстры вайсковых спецыяльнасцяў павінны былі несці вызначаную службу на замку [1, с. 155–157].

У XVI ст. кардынальна змянілася тактыка вядзення аблог замкаў, што вымусіла кіруючыя колы ВКЛ значна павысіць памер затрат на іх матэрыяльна-тэхнічнае пераўзбраенне. З большага гэта праблема была вырашана шляхам стварэння ўласнай вытворчасці агнястрэльнай зброі, што дазволіла хутка папоўніць гарадскія арсеналы новымі відамі ўзбраення. Пытанне стварэння сталых запасаў правізіі на выпадак працяглых ваенных кампаній вырашалася за кошт скарбу толькі пры ўзнікненні непасрэднай пагрозы гораду. Усё гэта ўказвае на тое, што без працягу рэфармавання сістэмы вайсковага і падатковага заканадаўства ВКЛ не здолее доўга супрацьстаяць усё больш нарастаючай пагрозе з боку агрэсіўна настроеных памкненняў суседніх дзяржаў, для якіх тэрыторыя Княства з’яўляецца перспектыўным пашырэннем іх жыццёвай прасторы і сферы ўплыву.

**Літаратура**


1. Акты Литовско-Русского государства/ С предисловием М.В.Довнар-Запольского.- М: Унив. тип., 1899.- Вып.1
2. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею/Ред. И.И. Григорович.- Т.3.- СПб., 1848.
3. Метрыка Вялікага княства Літоўскага кніга запісаў 28(1522-1552).- Мн.: Athenaeum 2000.
4. *Сагановіч Г.* Захоп Полацка Іванам IV паводле нямецкіх «лятучых лісткоў» 1563 г.// Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі.-Полацк, 1998.
5. *Янушкевіч А.М.* Вялікае княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558-1570гг.- Мн.: Медисонт, 2007.
9. *Brensztein M.* Zarys dziejow ludwisarstwa na ziemiach Wielkiego Ksiestwa Litewskiego.- Wilno: Ksiegarnia Stowarzyszenia nauczycelstwa polskiego, 1924. S.16-22.
10. *Nowak T.* Polska technika wojenna XVI-XVIII w. – Warszawa: Wyd. Min. Obrony Narodowej, 1965.
11. *Nowak T.* Sprzet artylerii polskiej XVI wieku w swietle inwentarza z lat 1551-1565// Studia i materialy do historii wojskowosci.- Warszawa: Wojskowy Instytut Historyczny, T.9 cz.2, 1963.
9. *Jablonowski A.* Rewizja zamkow ziemi Woiynskiej w polowie XVI wieku.- Warszawa: Skl. Gl. W ksieg. Gebethnera i Wolffa, 1877.